

# ЯЗЫКИ И МЕЖКУЛЬТУРНАЯ КОММУНИКАЦИЯ

**В.Г. НАТАЛЕВІЧ**

## *СЕМАНТЫКА КУПАЛЬСКАГА ВЯНКА Ў СВЕТАЎСПРЫМАННІ СТАРАЖЫТНЫХ БЕЛАРУСАЎ*

Язычніцкае Купала, свята летняга сонцавароту, было адным з найважнейшых свят у гадавым цыкле земляробчага календара. Адчувальная моц сонца, найбольшы росквіт прыроды, чаканне важнага часу — жніва — шмат у чым вызначаюць характар свята. У дахрысціянскія часы Купалле святкавалася усходнімі славянамі ў ноч з 23 на 24 чэрвеня старога стылю (з 6 на 7 ліпеня) у гонар язычніцкага бога сонца Купалы і прыпадала на зыход летняга сонцавароту, які ў старажытнасці выпадаў на 21—23 чэрвеня па старым стылі.

Уяўленні пра сакральны характар расліннага свету і абрады, звязаныя з гэтымі паняццямі, былі адным з важнейшых элементаў культу расліннасці. Чалавек міфалагізаванай свядомасці надаваў купальскім раслінам асаблівыя магічныя ўласцівасці. Лічылася, што ўсе зёлкі на Купалле набываюць незвычайную моц у сілу таго, што яны збіраліся ў магічны час. Фактычна ж у гэтым праявілася стыхійна-матэрыялістычнае ў аснове сваёй веданне: на Купалле прыпадала даспяванне траў, назапашванне ў іх лекавых уласцівасцей. Святаянскім травам акрамя рэальнага іх выкарыстання для лячэння ад хвароб архаічны чалавек прыпісваў апатрапеічную, мантычную функцыі: ім надавалася здольнасць адводзіць сурокі, “прысушваць” каханых, пазбягаць страты ўраджаю, абараняць ад маланкі, граду і г.д. — іх уласцівасці абсалютызаваліся.

Важным атрыбутам купальскай абраднасці з’яўляецца вянок. У еўрапейскіх народаў абрады з іванаўскімі вянкамі былі некалькіх відаў: іх выкарыстоўвалі або з мантычнымі, або з апатрапеічнымі мэтамі. Значнае распаўсюджанне атрымалі рытуальна-магічныя акцыі варажбы па вянках, што ў розных народаў мелі свае спецыфічныя асаблівасці. У абрадах варажбы па вянках адначасова выкарыстоўвалася магія расліннасці і вады. Глыбінную сувязь абраду пляцення вянкоў і пускання іх на ваду можна прасачыць пры суаднясенні слоў са значэннем вада і плесці (гнуць). Так, індаеўрапейскае ***uer** — *звязваць,* круціць мае падабенства з тахарскім **war** — *вада; гоцкае* **wato** — *вада* можна супаставіць з рускім **ветка, ветвь** — *галіна і* беларускім **вецце** — *матэрыял для пляцення* [1, *240*].

*Вольга Генадзьеўна НАТАЛЕВІЧ, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай і рускай моў Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта.*

Розныя народы мелі свой набор купальскіх раслін, што складалі святочны вянок. Беларускі звівалі вянкі з белых цюльпанаў, з дробненькага купала, дзівабрата, сініх званочкаў, сіняй смалянкі [2, *210*]. Купальскімі вянкамі ўпрыгожвалі галаву ў дзень свята, а потым па іх варажылі. На Беларусі вянкі перад вечарам кідалі ў ваду, а ў наступны дзень ішлі глядзець, у які бок іх аднесла, туды дзяўчыне і замуж ісці [2, *209*]. Сэнс абрадавай дзеі раскрываецца ў вербальных тэкстах, што яе суправаджаюць [3, *307—309*]:

Сягоння Яна Купалы,
Дзевачкі зелле збіралі.
Дзевачкі зелле збіралі
Да ў вяночкі сплятали.

Да ў вяночкі сплятали,
Да на вадзіцу пушчалі:
— Плывіце, вяночкі, аж на дно,
Скажыце пра мілага майго [3, *306*].

У Барысаўскім раёне дзяўчаты кідалі вянкі ў ваду, стоячы спіной да ракі. Існавала павер'е, што калі вянок заплыве далёка, быць замужам далёка ад дома, калі даплыве да другога берага, быць замужам за хлопцам з суседняй вёскі, калі вянок закруціцца і патоне, ніколі не быць замужам [4, *43*].

Некаторыя даследчыкі бачаць аснову варажбы з вадой у першапачатковай сувязі яе са светам памерлых [5, *163*]. Вераванне пра тое, што іншасвет знаходзіцца па другі бок воднай прасторы, вядома розным народам свету [6, *75—77*]. Варажба ўвогуле — гэта рытуал, скіраваны на ўсталяванне кантакту з тым светам з мэтай атрымаць веды пра будучыню. Больш познія ўяўленні нашых продкаў звязаны з вобразам вады як увасабленнем лёсу чалавека. У рускіх песнях сустракаюцца такія матывы варажбы па вадзе: колькі зачэрпнецца рачной вады, столькі шчасця і будзе адпушчана чалавеку [7, *158*].

Аднак, на нашу думку, абрад скідання вянка — сімвала дзявоцкасці — і пускання яго ў ваду адбываўся ў той тэмпаральны локус, калі прырода знаходзіцца ў стане найбольшага росквіту і ад яе ўжо чакаюць пладоў. Сам абрад падкрэсліваў, што дзяўчына, якая дасягнула палавой сталасці, павінна стаць жанчынай. Ва ўкраінскай паэзіі кінуты на ваду вянок нязменна выступае сімвалам заканчэння дзявоцтва [8, *44*]. Абрад скідвання вянка на Купалле непасрэдна звязаны з ініцыяцыяй дзяўчат. "У аснове гэтых абрадаў (жаночых ініцыяцый. — *В.Н.*) і таінстваў ляжыць глыбокі рэлігійны вопыт... Пачынаючы са старажытных стадый развіцця культуры, пасвячэнне адыгрывае асноўную ролю ў рэлігійным фарміраванні чалавека, асабліва калі яно складаецца са змен анталагічнага стану неафіта" [9, *116, 120*]. Падрабязна абрады хлапецкіх і дзявочых ініцыяцый даследуе бельгійскі вучоны А. ван Геннеп [10, *64—107*], нас жа цікавіць ініцыяцыя дзяўчат у летні сонцаварот. Абрад пераходу дзяўчыны ў жанчыну для дадзенага часу з'яўляецца натуральнай з'явай. Пацвярджаннем можа быць тое, што Купалу часам называюць дзявочым святам, калі адбывалася прыняцце дзяўчат паўнапраўнымі членамі ў род [11, *120*]. У Славеніі дзяўчаты пры падрыхтоўцы да Іванава дня два месяцы да яго жылі разам у якім-небудзь шалашы, у Беларусі і Польшчы купальская ноч лічылася ноччу вольнай любові [2, *209*; 12, *175, 208*]. Можна супаставіць асобныя абрады купальскага цыкла з ініцыяцыямі дзяўчат аўстралійскіх абарыгенаў і высветліць шэраг супадзенняў са славянскім святкаваннем. Такія элементы, як першапачатковая ізаляцыя, іспыты (у славян — скокі праз вогнішча), абранне шлюбу (у славян: скокі праз вогнішча разам з хлопцам), перыяд рытуальна-групавога шлюбу, калі з маладой жанчынай уступаюць у стасункі сябры яе "мужа" — толькі некаторыя элементы дзявочых ініцыяцый [11, *120*]. Аднак першапачатковы сэнс гэтага рытуалу — ініцыяцыя — быў паступова забыты, засталіся толькі некаторыя дзеянні, якія былі трансфармаваны ў адпаведнасці з асноўнымі ідэямі свята. У абрадзе скідання вянка непасрэдна выяўляецца сувязь

купальскай абрадавай практыкі з вясельнай, і, верагодна, толькі з цягам часу гэтая рытуальна-магічная акцыя пераўтварылася ў акт варажбы.

У агульнай структуры купальскай абраднасці дамінавалі дзявочыя варожбы, аднак сустракаюцца лакальныя мадыфікацыі мантычных цырымоній. “Цнатлівай варажбой на свой лёс” назваў наступны беларускі абрад І.І. Насовіч.

Пасля паўдня хлопцы і дзяўчаты пры ўмове, колькі дзяўчат, столькі і хлопцаў, усе разам накіроўваліся на луг ля рэчкі ці возера, і, прыйшоўшы на абранае месца, кожны збіраў кветкі і рабіў сабе вянок. Звіўшы папарна, як атрымаецца, пускалі свае вянкі на ваду і сачылі, як яны адплываюць. Разлучэнне вянкоў паказвала на нясуджанасць сумеснага жыцця; калі адзін вянок патоне — смерць; спыненне аднаго з вянкоў і прыстанне да іншага — не быць у пары з абранай асобай [13, *61*].

У Шумілінскім раёне Віцебскай вобласці вянкі таксама пускалі парамі ў возера (у стаячую ваду) на метр адзін ад аднаго. Ваду круцілі палкай і глядзелі: калі вянкі сыдуцца, то дзяўчыне суджана замуж ісці, калі разыдуцца — то не [14, *38*].

У в. Сальнікі Горацкага раёна дзяўчаты на вянок клалі дзве палачкі крыжнакрыж, пасярод якіх прымацоўвалі запаленую свечку. Пусціўшы вянок на ваду, прымаўлялі “Плыві, мой вянок, то уніз, то ўгару, к свякровінаму двару”. Па тым, што адбудзецца з вянком (паплыве, спыніцца, закруціцца, патоне), меркавалі пра свой лёс. Калі вянок круціцца, значыць быць у дзеўках, калі паплыве — выйдзе дзяўчына замуж, калі стаіць на месцы, замуж пакуль не пойдзе [15, *68*].

У купальскіх (як і ў траецкіх) варожбах з пусканнем вянкоў у ваду ў большасці рэгіёнаў удзельнічалі толькі дзяўчаты, што, верагодна, звязана з архаічнымі абрадамі ініцыяцый. Удзел хлопцаў у мантычных абрадах з’яўляецца, хутчэй за ўсё, больш познім напластаваннем, што носіць спецыфічна мясцовы характар.

Каханне і замужжа з’яўляецца скразной тэмай Купалля ў шматлікіх вербальных тэкстах, захаваных усходнеславянскай фальклорнай практыкай [3, *144, 205, 230, 276, 280*; 16, *468*]. У беларускіх купальскіх песнях, звязаных з мантычнымі абрадамі [3, *208—210*], у лірычным псіхалагічным кантэксце пранікліва перадаюцца перажыванні дзяўчыны наконт жыццёвых зменаў у сувязі са шлюбам:

Пайду малада, у гарод,
Пушчу коніка напярод:
— Паеш, косенька, зёлачкі,
Усе барвовыя васількі.
Знаць, мне ў мамкі не быць,
З васількоў вянка не віць.
[З васількоў вянка не віць],
Хоці віці — не насіці:
Будуць насіць сястрычкі,
Будуць гуляць брацеткі [3, *210*].

Абрад варажбы па вянках на Украіне меў свае спецыфічныя асаблівасці. Украінкі для купальскіх вянкоў збіралі чырвоныя валошкі, панскі мак, жоўты святаяннік, наготкі, разнацвет, мяту, званочкі, у яго абавязкова ўплялі палын. Вянок апускалі на дно ракі і сачылі, ці ўсплыве, калі так — дзяўчына пойдзе замуж у той жа год [17, *38*].

На Валыні зафіксаваны спосаб варажбы па вянках, падобны да беларускага: па рацэ дзяўчаты пускалі два вянкі, на сябе і на хлопца; лічылася, што калі вянкі сыдуцца, дзяўчына пойдзе за хлопца замуж [18, *9*]. Часам да вянкоў прымацоўвалі запаленыя свечы і пускалі на ваду. Украінцы верылі, што чыя свечка раней згасне, той і памрэ раней [17, *39*]. Свечка ўвогуле ў абрадах і павер’ях стала сімвалам жыцця. У казках усходніх славян гаворыцца, што *свечка / зорка / лямпа гарыць* — чалавек жыве, згасне свечка або лямпа, упадзе

зорка — чалавек памірае. Такое ж стаўленне да жыцця і смерці ў названай абрадавай дзеі.

Першапачатковы сэнс абраду пускання вянкоў па вадзе быў, верагодна, не мантычны, а іншы. Яго раскрывае прымаўка, захаваная нашымі заходнімі суседзямі, палякамі "Na święty Jan woda kwitnie". — "На святога Яна вада квітнее" [12, *65*]. Сэнс гэтага выслоўя заключаецца ў тым, што пусканне кветак у ваду мела сваёй мэтай пажадання ёй зычлівасці, а само зелле, якое кантактуе з вадой, набывала лекавую моц. Такім чынам, абрад пускання вянкоў на ваду ўзыходзіць, верагодна, да ўшанавання самой вады. Таксама неабходна мець на ўвазе той факт, што зеляніна сама па сабе з'яўляецца сімвалам жыцця. Нездарма ўвасабленнем абуджэння прыроды ў веснавых абрадах служыць чалавек, абвіты зелянінай. Толькі з цягам часу першапачатковая функцыя абрадавай дзеі пускання вянкоў была забытая, і абрад стаў выконваць выключна мантычную функцыю.

Вянкі, што плылі па вадзе, з'яўляліся сродкам мантычнай магіі і ў шматлікіх еўрапейскіх абрадавых практыках. Вянкі з іванаўскіх траў плялі і пускалі на ваду палякі, чэхі, славакі, венгры, латышы, аўстрыйцы, партугальцы [12, *52, 86, 146, 166, 175*].

Па тым, як паплывуць вянкі, варажылі на замужжа, будучы лёс, працягласць жыцця. На св. Яна ў Партугаліі жаніх і нявеста плялі аднолькавыя вянкі і кідалі іх у раку, укладалі ў сярэдзіну прасмаленую анучку і падпальвалі яе. Калі вянкі прыбівала да берага адначасова, пару чакала вяселле; лічылася, што першым павінен быў памерці той, чый агонь згасне раней. Самым лепшым знакам лічылася, калі абодва вянкі разам плылі па рацэ, і агні доўга гарэлі. Дрэнным знакам было, калі вянкі разыходзіліся ў розныя бакі, або ў розны час пыставалі да берага [12, *52*]. У Польшчы маладыя дзяўчаты пускалі раніцай па рацэ два вянкі ды прыгаворвалі: "Jutro św. Janek, puśćmy na wodę wianek" —"Раніцай св. Яна пусцім на ваду вянок" [19, *383*]. Яны сачылі за вянкамі і па іх руху варажылі: калі вянкі сыдуцца, іх уладарка выйдзе замуж, калі патонуць, —памрэ [12, *175*]. Дзеля надання вянкам большай магічнай сілы палякі, як і лужычане, плялі вянкі рана раніцай моўчкі з траў няцотнай колькасці і дадавалі ў іх расліны рэзкага паху [12, *315*]. У Славакіі плялі вянкі "з дзесяці траў", кідалі іх у ваду і сачылі, з якога боку будзе жаніх, ці хутка яны выйдуць замуж [12, *186*]. У Аўстрыі сплятаалі вянкі, кідалі іх у раку, а па тым, як плыве вянок, варажылі на працягласць жыцця і на будучае замужжа [12, *145*].

Еўрапейскія народы мелі і іншыя абрады варажбы па вянках у некаторай ступені падобныя да ўсходнеславянскіх актаў варажбы. У мазураў (Польшча), згодна са звычаем, вянкі на дрэва кідалі хлопцы. Лічылася, што хлопец ажэніцца праз столькі год, колькі разоў вянок замацуецца на дрэве [12, *157*]. Падобны абрад існаваў у дзяўчат паўднёва-ўсходняй Маравіі. Чэшскія дзяўчаты кідалі вянкі на яблыні тройчы. Калі вянок зачэпіцца за дрэва адразу, верылі, што шлюб адбудзецца ў бягучым годзе; калі з другой спробы або трэцяй, адпаведна замужжа трэба чакаць праз два і тры гады [12, *186*]. У Македоніі і Славеніі дзяўчаты кідалі вянкі за страху, і калі траплялі тройчы — гэта было знакам хуткага замужжа [12, *211*]. Чэхі і славакі кідалі вянкі праз вогнішча, як і беларусы, варажылі пра тое, з якога боку прыйдзе будучы жаніх [12, *186*]. У некаторых раёнах Румыніі, каб даведацца пра свой лёс, вянкі кідалі на дах хаты, як у Расіі кідалі лазневыя вянкі з купальскімі травамі. Калі вянок трапляў на дах з першага разу, лічылася, што жыццё яго ўладаркі будзе шчаслівым; у іншым выпадку можна чакаць розных няшчасцяў, нават смерці. Акрамя таго, вянкі кідалі на жывёл: калі вянок трапляў на маладую жывёлу, гэта прадвяшчала шлюб з маладым чалавекам, калі на старую — са старым [12, *249*]. Відавочна, усе гэтыя абрады маюць выразную сувязь са шлюбнай сімволікай.

У Расіі пусканне вянкоў па вадзе, разам з іншымі абрадамі (кумаванне, завіванне вянкоў, абрад "Зязюля") было перанесена на Тройцу. Гэты абрад шырока распаўсюджаны на тэрыторыі Расіі, акрамя паўночных абласцей, дзе часам плялі вянкі і варажылі па іх на Купалу [20, *190*]. На большай тэрыторыі Расіі "завіваць вянкі" хадзілі на Сёмік. Гэты абрад лічыўся чыста дзявочым, таму што ў ім удзельнічалі дзяўчаты, у некаторых месцах маладыя жанчыны.

Купальскія звычаі і абрады, звязаныя з іванаўскімі вянкамі, захаваліся ў трансфармаваным выглядзе да нашых дзён. Іх поліфункцыянальнасць тлумачыцца тым, што яны прайшлі доўгі і складаны шлях развіцця, не былі статычнымі, а ў кожную эпоху напаўняліся новым зместам. З цягам часу сэнс некаторых рытуалаў забываўся або пераасэнсоўваўся, адбываўся працэс развіцця абраду, адны рытуальна-магічныя акцыі перапляталіся з іншымі. Прыкладам такога роду з'яўляецца абрад пускання вянкоў на ваду, які паступова з акта ўшанавання вады пераўтварыўся ў мантычную абрадавую дзею, што з часам набыла ўпрыгожанне ў выглядзе запаленых свечак ці прасмаленых анучак, якія ўстаўлялі ў сярэдзіну вянкоў. Рытуальна-магічная акцыя стала ўяўляць сабой маляўнічае відовішча, што значна ўпрыгожвала свята.

## Літаратура


1. *Маковский М.М.* Сравнительный словарь мифологической символики в индоевропейских языках: Образ мира и миры образов. М., 1996.
2. *Романов Е.Р.* Белорусский сборник. Вильно, 1912. Вып. 8.
3. Купальскія і пятроўскія песні / Уклад. А.С. Ліса, С.Т. Асташэвіч, уклад. муз. часткі Г.В. Таўлай // БНТ: Беларуская народная творчасць. Мн.,1985.
4. *Гуд П.А.* Беларускае Купалле: Кампазіцыя і семантыка абрадавых дзей. Мн., 1999.
5. *Виноградова Л.Н.* Зимняя календарная поэзия западных и восточных славян. Генезис и типология колядования. М., 1982.
6. *Иванов В.В., Топоров В.Н.* Славянские языковые моделирующие семиотические системы: Древний период. М., 1965.
7. *Еремина В.И.* Ритуал и фольклор. Л., 1991.
8. *Костомаров Н.И.* Славянская мифология: Исторические монографии и исследования. М., 1994.
9. *Элиаде М.* Священное и мирское / Пер. с франц., предисл. и коммент. Н.К. Гарбовского. М., 1994.
10. *Геннеп А. ван.* Обряды перехода. Семиотическое изучение обрядов / Пер. с франц. М., 1999.
11. *Власов В.Г.* Формирование календаря славян: ранний период // Календарь в культуре народов мира. М., 1993.
12. Календарные обычаи и обряды в странах Зарубежной Европы: Летне-осенние праздники. М., 1978.
13. *Носович И.И.* Белорусские песни. Записки РГО по отделению этнографии: В 6 т. СПб., 1873. Т. 5.
14. *Минько Л.И.* Календарные праздники // Белорусы. Мн., 1998.
15. *Васілевіч У.* Дай божа знаць, з кім век векаваць: Беларуская народная варажба. Мн., 1993.
16. *Коваль У.І., Новак В.С.* Беларускія народныя святы і звычаі. Гомель, 1993.
17. *Чубинський П.* Мудрість віків: Украінскае народознавство у творчій спадщині Павло Чубинського: У 2 кн. Київ, 1995. Кн. 1.
18. *Українка Л.* Купала на Волыні // Збор творів: У 9 т. Київ, 1997. Т. 9.
19. Słownik folkloru polskiego / Pod red. J. Krzyżanowskiego. Wiedza powszechna, 1965.
20. *Соколова В.К.* Весенне-летние календарные обряды русских, украинцев и белорусов. М., 1979.